Магілеўскі
ВЫБАР
№ 6 (32) Верасень 2014 г.
Абласная Дэмакратычная Трыбуна

ОТОВСЮДУ ПОНЕМНОГУ

В январе-августе 2014 года использовано 10 689,5 млрд. рублей инвестиций в основной капитал, что в сопоставимых ценах составляет 89% к уровню января-августа прошлого года. Строительно-монтажные работы за 8 месяцев текущего года выполнены на 4 520,8 млрд. рублей (69,4% к уровню соответствующего периода 2013 г.). Удельный вес строительно-монтажных работ составил 42,3% от общего объема инвестиций в основной капитал.

Сельхозорганизации области намерены собрать около 180 тыс. т картофеля, из них около 100 тыс. т реализовать за пределы страны: в основном в Российскую Федерацию, а также страны СНГ. Около 30 тыс. т планируется оставить на семена, 25 тыс. т пустить в переработку, а остальное реализовать на внутреннем рынке.

***"Сейчас наша главная задача - реализовать выращенный урожай. Рынок еще, к сожалению, не активен. Запросов из-за пределов страны на покупку второго хлеба пока очень мало. Но мы надеемся, что ситуация изменится в самое ближайшее время "*, - отметили в комитете по сельскому хозяйству и продовольствию Могилевского облисполкома.**

На учете в налоговых инспекциях Могилевской области по состоянию на 1 сентября 2014 г. состоит 24923 индивидуальных предпринимателей, которыми за 8 месяцев текущего года уплачено 237,8 млрд. рублей платежей в бюджет. По сравнению с аналогичным периодом 2013 года поступления от индивидуальных предпринимателей увеличились на 35,4 млрд. рублей.

Подготовил
Антон ДУБОЛОМОВ.

Быть кнутом... или храбрый Рудник

Отношения, связанные с ведением гражданами Республики Беларусь личных подсобных хозяйств (ЛПХ), регулируются Гражданским кодексом Республики Беларусь, Кодексом Республики Беларусь о земле, Законом Республики Беларусь от 11 ноября 2002 г. №149-З "О личных подсобных хозяйствах граждан", в котором, кстати, прописана и государственная поддержка. Государство гарантирует гражданам соблюдение их прав и защиту законных интересов, связанных с ведением личного подсобного хозяйства. В то же время вмешательство государственных органов в деятельность граждан по ведению личного подсобного хозяйства не допускается, за исключением случаев, установленных законодательными актами Республики Беларусь. И государству в лице местных органов власти есть где приложить усилия по исполнению данного Закона. Местные власти (сельсоветы, райсоветы и райисполкомы, облсоветы и облисполкомы) должны: создавать консультационные пункты и пункты проката сельскохозяйственной техники, гужевых и других средств по оказанию гражданам, осуществляющим ведение личного подсобного хозяйства, услуг по возделыванию сельскохозяйственных культур и уборке урожая, заготовке кормов, реализации выращенной продукции, заготовке топлива, обработке земельных участков; оказывать помощь в реализации излишков сельскохозяйственной продукции, произведенной в личных подсобных хозяйствах; проводить ежегодно мероприятия по профилактике инфекционных и инвазионных заболеваний животных, находящихся в собственности граждан, осуществляющих ведение личного подсобного хозяйства; реализовывать гражданам, осуществляющим ведение личного подсобного хозяйства, племенного молодняка скота (свиней, крупного рогатого скота, лошадей), птицы, минеральных и органических удобрений, средств защиты растений, посадочного материала сельскохозяйственных культур, комбикормов и зерна на кормовые цели; обеспечивать личные подсобные хозяйства в сенокосах и пастбищах для личного скота.

В случае сопротивления местной властью предлагаемым мерам Закон обращает внимание на тот факт, что граждане осуществляют ведение личного подсобного хозяйства по своему усмотрению и под свою ответственность, а для самых ретивых чиновников уточняет, что служба Родине на подворьях не относится к предпринимательской деятельности.

В системе аграрных отношений Республики Беларусь личные подсобные хозяйства (ЛПХ) не только традиционная форма самообеспечения населения продуктами питания, но и эффективный ресурс для государственного развития. Имея в пользовании 12,3% пашни, подворья производят 89%


шерсти, 87% картофеля, 81% овощей, 32% яиц, 13% молока и 12% мяса. Зерна производится 5% от государственного каравая или в 3 раза больше, чем фермерские хозяйства страны. В 2013 году в ЛПХ произведено 22,6% (продукции животноводства 24,1%) от валового производства сельскохозяйственной продукции в РБ. Согласитесь, не мало. И, казалось бы, что государство кровно заинтересовано в развитии ЛПХ: продукция качественная, дотации изыскивать не нужно, закупочные цены низки, горюче-смазочные материалы и электроэнергия потребляется по минимуму, зарплату выплачивать не нужно. Печатай, родное государство, деньги и получай практически бесплатную продукцию. Ан, нет, своеобразная природа белорусского чиновника проявляется с точностью наоборот – повсеместно проблемы с пастбищами и сенокосами для ЛПХ, с ветеринарным обслуживанием скота, комбикормом. Про организацию консультационных пунктов и пунктов проката техники можно говорить, имея огромные запасы чувства юмора.

А всё от того, что в прежние времена именно продукция ЛПХ формировала экономическую эффективность сельскохозяйственного производства и, особенно, перерабатывающих предприятий. Иллюзия эффективности крупномасштабного производства и перспектива монополизации денежной выручки от переработки, в первую очередь, молока и мяса, предопределила судьбу ЛПХ в масштабах страны. В частности, производство продукции животноводства в ЛПХ снижается с 2002 года, перепады в производстве растениеводческой продукции по годам достигают 19%. За минувшие 10 лет численность свиней и крупного рогатого скота (и коров тоже) на подворье снизилось в 2 раза, что и предопределило резкое снижение производства продукции.

Но особенно пострадало в последнее время свиноводство - как в целом по республике (в 2014 году свинопоголовье снизилось на 15,3%), так и в ЛПХ (на 54% к уровню предыдущего года).

Причиной снижения численности свиней в РБ считается **наличие африканской чумы свиней (АЧС)** на территории республики. Главной особенностью этой болезни для ЛПХ – ее **запрещено лечить**, а меры борьбы предполагают уничтожение поголовья и сжигание трупов больных животных, а также построек, кормов и навоза.

В 2013 г. в негосударственной прессе и на отдельных сайтах прошла информация об очагах АЧС на территории Беларуси. Главная задача в этих условиях



– сохранение крупномасштабного производства свинины и недопущение снижения поголовья скота фермерскими хозяйствами и ЛПХ. И упор необходимо сделать именно на комплексы и крупные фермы – погибнет свинопоголовье в стране – «ляжет» экономика государства. Мало того, прекратит функционирование соответствующая инфраструктура, что приведет к невозможности содержания скота в ЛПХ и фермерами.

Нужно отдать должное, соответствующими органами были предприняты беспрецедентные меры для недопущения распространения АЧС по стране, что позволило министру сельского хозяйства и продовольствия заявить, что АЧС в Беларуси нет.

В этот же период самые жесткие требования были предъявлены населению, которое содержало на подворьях свиней. Правительство издало Постановление от 29 августа 2013 года №758 «О дополнительных мерах по ликвидации и недопущению распространения африканской чумы свиней и других опасных заболеваний животных». Согласно Постановлению, запрещается реализация свинины и продуктов убоя свиней, комбикормов, кормовых смесей, отрубей, кормовых отходов мукомольного и крупяного производства, белково-витаминных минеральных добавок и премиксов юридическими и физическими лицами, в том числе индивидуальными предпринимателями, за исключением мясоперерабатывающих предприятий, без согласования с государственной ветеринарной службой, а также импорт этой продукции из неблагополучных по африканской чуме свиней стран (регионов), неорганизованную торговлю свининой.

Кроме того, законодательно запрещено **содержание свиней** в личных подворьях работников, занятых на свиноводческих комплексах. Запрещается содержать свиней в крестьянских (фермерских) хозяйствах, а также на личных подворьях, расположенных **в радиусе 5 км** от свиноводческих комплексов и ферм. Ветеринарный врач, который обслуживает комплекс, тоже не должен иметь свиней, ему запрещено работать в личных подворьях граждан. Невыполнение требований вышеназванного постановления Совета Министров республики влечет не только **административную**, но и **уголовную ответственность**.

Понятно, что республике, в том числе и по Могилевской области, местные чиновники взялись за уничтожение поголовья свиней на подворьях. В чем-то они были правы – сегодня важнее не допустить очаг АЧС, чем личные амбиции и проблемы хозяев ЛПХ. Но и пределы ретивости тоже должны быть, тем более, что в момент, когда профилактические меры борьбы с АЧС необходимо соблюдать особенно тщательно (периодом особого риска является **вторая половина лета и первая половина осени)**, председатель облисполкома Рудник П.М. допустил беспрецедентный поступок, граничащий с нарушением зако-

дательства. Проводя в райисполкоме Могилевского района прием граждан, он лично изменил границы зоны выращивания свиней населением вокруг свинокомплексов с 5 до 1 км. Свиней, по словам чиновника, можно выращивать и в однокилометровой зоне, но при условии соответствия всем требованиям санитарно-эпидемиологической службы. Но почему же тогда местные ответственные лица целый год третировали хозяев ЛПХ за содержание скота, вызывали на административную комиссию, не разрешали им продавать свинину на местном рынке? Многие из граждан ушли из этого «бизнеса».

К тому же не так давно (5 августа) уважаемый Президент требовал от руководящих работников всех уровней организовать на свинокомплексах пропускной режим, «как на ядерном объекте». В противном случае к виновным будут применены меры вплоть до уголовного наказания. И от чего же так осмелел Петр Михайлович? Неужели в Могилевской области все так хорошо с АЧС?

К сожалению нет, получается совсем наоборот. Несколько дней назад из Чериковского района ко мне обратились за консультацией жители одной из деревень по поводу сложившейся ситуации на свинокомплексе «Светлый». Ликвидация свинопоголовья и карантин на 1 год явно указывают на неблагополучие по АЧС в данном хозяйстве. Пусть эта беда минет нашу страну, но именно председатель облисполкома по Постановлению №758 несет персональную ответственность за выполнение первоначальных мероприятий по ликвидации африканской чумы свиней и недопущение распространения заболевания по Могилевской области.

Жители, интересующиеся перспективой свиноводства в их деревне рядом со свинокомплексом «Светлый», подсказали интересную вещь – это хозяйство является структурным подразделение комбината хлебопродуктов. И вполне возможно, что из-за псевдорачительности руководства остатки комбикорма могут быть использованы и на других свинокомплексах – «Огневском», например. И где гарантия, что через корма не произойдет заражение свиней в других хозяйствах области? Совсем рядом, например, свинокомплекс «Восход»….

Сегодня П.Рудник, расхрабрившись без особых оснований, принял в конкретном случае могилевского свиновода вполне разумное решение, но на местах все это будет превращено в фарс – кто кого обгонит в нарушениях ветеринарного законодательства. Это мы уже проходили.

Демократическая общественность в этих условиях предлагает местным властям:

- изменения законодательства в области реального функционирования ЛПХ;

- обеспечение ЛПХ качественным ветеринарным обслуживанием, в том числе через создание специализированных агрозооветучастков;

- доведения заданий государственным сельскохозяйственным организациям по выделению кормовых угодий по нормативам обеспечения КРС пастбищами и сенокосами;

- снабжение ЛПХ качественными и проверенными кормами, расширение торговли комбикормом;

- разработка мероприятий по предотвращению заражения АЧС для каждого подворья;

- проектирование хозяйственных построек с учетом возможности предотвращения заражения;

- разрешить торговлю свининой частным подворьям на местных рынках;

- организация боен в каждом районе или выделение специалиста за наблюдением порядка убоя скота на подворье.

Реализация этих мер позволит принимать смелые решения любым чиновником, а не заниматься популизмом, пусть даже и временно обладая должностью председателя облисполкома, как это сделал П.Рудник.

В Указе Петра 1 от 1719 года «О битии мясниками скотины в показанном месте» с нарушителями Указа боролись *«…битием кнутами и ссылкой на каторгу».* Знал царь опасность нарушения ветеринарных правил, потому и крут был. Нашим же чиновникам Указ не указ, а посему и «подставляют» страну под «свинские» проблемы, не думая о последствиях. Кнутом стегать их вроде, как и устарело – чай, не XVIII век на дворе.

Петр МИГУРСКИЙ.

Санкцыі за парушэнні

У Магілёўскім раёне тром супрацоўнікам райаграпрамтэхнікі вынесена папярэджанне за парушэнне прыродаахоўнага заканадаўства, у дачыненні да кіраўніка і юрыдычныя асобы будзе ініцыяваны адміністрацыйны працэс. Пра гэта паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету.

Суразмоўцы распавялі, што патрулюючы акваторыю ракі Друць, дзяржінспектары Магілёўскай міжрайінспекцыі заўважылі, што ў раёне вёскі Семукачы водаахоўная зона забруджаная сцёкавымі арганічнымі водамі - адходамі вытворчасці мясцовай фермы. А каля вёскі Вялікія Бялевічы побач з ракой зроблены летні лагер для буйной рагатай жывёлы.

Непадалёк на сельскагаспадарчым полі механізатар прыбіраў кукурузу з парушэннем правілаў - ад краю да цэнтра ўчастка. Спецыялісты растлумачылі, што такі спосаб можа прывесці да масавай гібелі дзікіж жывёл, якія жывуць на полі: зайцоў, курапатак, цецерукоў і інш. Асабліва калі ралля размешчана ў межах паляўнічых угоддзяў.

Яшчэ напярэдадні летняга сезона дзяржінспектары накіроўвалі кіраўніцтву райаграпрамтэхнікі прадпісанне аб недапушчальнасці падобных дзеянняў. Цяпер як да прадпрыемства, так і да яго кіраўніка будуць прад'яўленыя штрафныя санкцыі.

Міхась БАРАЗНА.

Паводле mogilevnews.by

Лісты ляцяць з пракуратуры…

Жыхарка вёскі Дамамерычы Клімавіцкага раёна Алена Марчанка атрымала адказ з пракуратуры Магілёўскай вобласці на сваю скаргу аб парушэнні заканадаўства пры размяшчэнні свінагадоўчага комплекса на тэрыторыі былой жывёлагадоўчай фермы.

Першы намеснік пракурора Магілёўскай вобласці Алег Пімашкоў паведаміў спадарыні Марчанка, што яе скарга накіраваная для далейшага разгляду ў Магілёўскі аблвыканкам.

Па меркаванні Алены Марчанка, такім чынам пракуратура проста самаўхілілася ад разгляду скаргі на парушэнне заканадаўства, хоць менавіта кантроль за дакладным выкананнем законаў і пастаноў з'яўляецца адной з галоўных задач пракуратуры.

Спадарыня Марчанка сама мае юрыдычную адукацыю, і адзначае, што не можа патлумачыць з пункту гледжання права, чаму супрацоўнікі пракуратуры не хочуць выконваць свае службовыя абавязкі. *"Згодна з беларускім заканадаўствам, менавіта пастаянны кантроль за дакладным выкананнем законадаўства з'яўляецца адным з галоўных абавязкаў органаў пракуратуры нашай краіны"* - кажа Алена Марчанка. У скарзе, накіраванай раней у Магілёўскі аблвыканкам і адначасова пракурору Магілёўскай вобласці, А.Марчанка прасіла закрыць свінагадоўчы комплекс "Царкавішча", адмяніць рашэнне Клімавіцкага райвыканкама аб вызначэнні населеных пунктаў, якія знаходзяцца ў пяцікіламетровай зоне ад комплекса, і пакараць вінаватых у парушэнні заканадаўства пры размяшчэнні комплекса. Згодна спадарыні Марчанка, размяшчэнне свіней на комплексе ў вёсцы Царкавішча супярэчыць заканадаўству. Паводле пастановы Міністэрства сельскай гаспадаркі, якім устаноўлены патрабаванні да ўмоў гадоўлі свіней, забараняецца размяшчэнне комплекса на тэрыторыі былых жывёлагадоўчых памяшканняў. Між тым, як высветліла Алена Марчанка на падставе архіўных дакументаў, свінагадоўчы комплекс "Царкавішча" знаходзіцца на тэрыторыі былой малочна-таварнай фермы №7 калгаса імя Калініна. Як адзначаецца ў скарзе, забарона на размяшчэнне свіней на тэрыторыі былых жывёлагадоўчых памяшканняў дзейнічае яшчэ з савецкіх часоў і з'яўляецца прапісным правілам для ветэрынараў.

Акрамя гэтага, комплекс "Царкавішча" не мае адпаведнай інфраструктуры: ён не забяспечаны зручнымі пад'язднымі шляхамі, не мае належнага занальнага раздзялення, у ім адсутнічае належная агароджа, - усё гэта таксама, па меркаванню спадарыні Марчанка, з'яўляецца парушэннем заканадаўства.

Нагадаем, што 17 чэрвеня Алена Марчанка здолела дамагчыся ў судзе Клімавіцкага раёна адмены пастановы адміністрацыйнай камісіі Клімавіцкага райвыканкама аб пакаранні яе штрафам у памеры 15 базавых велічынь (2 250 000 рублёў) за парушэнне ветэрынарных, ветэрынарна-санітарных правіл, і спынення адміністрацыйнай справы ў адносінах да сябе.

Супрацьстаянне спадарыні Марчанкі з мясцовымі ўладамі пачалося пасля таго, як яна выступіла супраць знішчэння сваіх свіней у сувязі з небяспекай распаўсюджвання афрыканскай чумы свіней.

А.Марчанка займаецца свінагадоўляй, каб былі грошы аплочваць лячэнне і навучанне сына, які з'яўляецца інвалідам з дзяцінства.

Грамадскі актывіст з Хоцімска Валерый Каранкевіч 3 верасня атрымаў адказ на сваю скаргу ў Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь з пракуратуры Магілёўскай вобласці.

У лісце за подпісам пракурора Магілёўскай вобласці Аляксандра Чадзюка актывісту паведамілі, што яго скарга на неправамерныя дзеянні супрацоўнікаў Хоцімскага РАУС па затрыманню і дастаўцы ў раённы аддзел унутраных спраў разгледжана пракуратурай Магілёўскай вобласці з вывучэннем матэрыялаў праверкі.

"Устаноўлена, што 23.03.2014 каля 20-00 Вы былі затрыманы і дастаўлены супрацоўнікамі Хоцімскага РАУС у памяшканне раённага аддзела ўнутраных спраў для апытання падчас праверкі па заяве Тамашэва М. В. аб прыцягненні Вас да адказнасці за паклёп. Указаныя дзеянні былі выкліканы тым, што Вы ўхіляліся ад законных патрабаванняў аб яўцы ў РАУС для дачы тлумачэнняў па сутнасці выкладзенага ў звароце Тамашэва М. В. факта", - піша А.Чадзюк.

Па выніках разгляду скаргі спадара Каранкевіча пракурор прыйшоў да высновы, што падстаў для вынясення актаў пракурорскага нагляду не маецца. Ён таксама паведаміў актывісту, што той мае права абскардзіць прынятае рашэнне ў Генеральнай пракуратуры РБ.

"Я падаваў скаргу на імя Генеральнага пракурора, бо спадзяваўся, што хоць там адбудзецца справядлівы разгляд, аднак паперу перанакіравалі ў пракуратуру Магілёўскай вобласці. Я не магу пагадзіцца з адказам, зараз буду падаваць яшчэ адну скаргу ў Генеральную пракуратуру і запісвацца на асабісты прыём да яе кіраўнікоў, - кажа В.Каранкевіч. - *Я ні ад каго не хаваўся, не ўхіляўся ад сустрэчы з супрацоўнікамі міліцыі - яны мяне нікуды не выклікалі да гэтага інцыдэнта. А тут яны хуценька забіраюць мяне непасрэдна з выбарчага ўчастка прама перад пачаткам падліку галасоў - і пракурор Магілёўскай вобласці пры гэтым лічыць дзеянні супрацоўнікаў хоцімскай міліцыі правільнымі! Я ўпэўнены, што ўсё гэта скіравана на тое, каб запалохаць актывістаў і запэўніць супрацоўнікаў міліцыі ў іх беспакаранасці, бо ў наступным годзе павінны адбыцца прэзідэнцкія выбары. Хоцімскія міліцыянеры без усялякіх падстаў затрымлівалі мяне і на парламенцкіх выбарах 2012 года, і на выбарах у мясцовыя Саветы ў гэтым годзе, а пракуратура пастаянна лічыць іх дзеянні законнымі".*

Нагадаем, што 23 сакавіка кандыдат у дэпутаты Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў і кандыдат у дэпутаты Хоцімскага райсавета В.Каранкевіч быў затрыманы супрацоўнікамі Хоцімскага РАУС на выбарчым участку №3 у Хоцімску і дастаўлены ў РАУС, дзе яго ўтрымлівалі каля 40 хвілін і адпусцілі без складання пратакола затрымання.

Барыс ВЫРВІЧ.

Улады ізноў збіраюцца змагацца з прыпіскамі

Напрыканцы жніўня на пасяджэнні Магілёўскага аблвыканкама было разгледжана пытанне “Аб стане і мерах па барацьбе з карупцыяй у Магілёўскай вобласці у першым паўгоддзі 2014 года”. У шэрагу іншых



праблем удзельнікамі пасяджэння была звернутая ўвага на тое, што ў рэгіёне фіксуецца шмат выпадкаў фальсіфікацыі статыстычнай справаздачнасці.

У прыватнасці, шэраг праблем маецца ў АПК рэгіёна. Падчас праверак прадпрыемстваў аграпрамысловага комплекса ўстаноўлены факты дачы незаконных указанняў аб унясенні заведама ілжывых звестак у статыстычную справаздачнасць. У выніку ўзбуджана 40 крымінальных спраў, фігурантамі па некаторых з іх сталі нават кіруючыя работнікі з Быхаўскага і Чавускага райвыканкамаў .

Выяўлены факты злоўжываннях службовымі паўнамоцтвамі з боку пасадавых асобаў прадпрыемстваў АПК Магілёўскай вобласці, якія з асабістай зацікаўленасці афармлялі фіктыўныя дакументы аб рэалізацыі малака працаўнікам гаспадарак. Пры гэтым ужо ў ліпені адпаведная статыстычная справаздачнасць паказала зніжэнне вытворчасці малака к паўгоддзю мінулага года ў шэрагу раёнаў вобласці, асабліва ў тых, дзе супрацоўнікамі органаў унутраных спраў выяўлены прыпіскі - Чавускім, Бабруйскім, Краснапольскім і Быхаўскім.

Што ж, можна толькі парадавацца таму факту, што чыноўнікі з Магілёўскага аблвыканкама нарэшце звярнулі ўвагу на шматлікія прыпіскі ў сельскагаспадарчай галіне Магілёўскай вобласці. Праўда, мне асабіста не зусім зразумела, чаму ў якасці парушальнікаў статыстычнай справаздачнасці называюцца прадстаўнікі толькі некалькіх раёнаў Магілёўскай вобласці. Паверце мне на слова, прыпіскі даўно ўжоператварыліся ў сістэму і існуюць у вобласці практычна паўсюдна. Спытайцеся ў любога спецыяліста сельскагаспадарчага прадпрыемства і яны вам з задавальненнем распавядуць пра тое, як тыя ж райвыканкамаўскія чыноўнікі прымушаюць іх “маляваць” прыгожыя лічбы неіснуючых надояў, прывагаў, ураджайнасці збожжа і іншых сельскагаспадарчых культур. Ну а пасля бедныя жывёлы вымушаны “з’ядаць” і “выпіваць” цэлую процьму існуючых толькі на паперы кармоў. Праўда, чамусьці нашы слаўныя супрацоўнікі праваахоўных органаў Магілёўшчыны не вельмі звяртаюць увагу на тое, колькі ж малака выпіваюць цяляты і колькі канцэнтратаў з’ядаюць каровы ў асобных гаспадарках. Ды і на тое, колькі збожжа застаецца ў сусеках пры заўленай высокай ураджайнасці пасля “усушкі і ўтрускі”, - у многіх гаспадарках ужо ў лютым-сакавіку не застанецца канцэнтратаў.

Што самае цікавае, пра гэта выдатна ведаюць чыноўнікі самых розных рангаў, аднак проста закрываюць на такія прыпіскі вочы – трэба ж выконваць прагнозныя паказчыкі. Таму асабіста я не вельмі веру, што дадзенае на пасяджэнні Магілёўскага аблвыканкама Пятром Руднікам даручэнне УУС працягнуць правядзенне праверак арганізацый АПК на прадмет выяўлення парушэнняў, звязаных з улікам сельскагаспадарчай прадукцыі, завышэннем вытворчых паказчыкаў, утойваннем нястач, прадстаўленнем скажонных дадзеных статыстычнай справаздачнасці дасць нейкі відавочны плён. Не дапаможа моцна нават прапанова старшыні аблвыканкама скасоўваць працоўныя кантракты з адказнымі асобамі ў выпадку знаходжання вышэйпералічаных фактаў, бо пакуль тыя факты знойдуць, а за выкананне прагнозных паказчыкаў райвыканкам і той жа аблвыканкам “душаць” кіраўнікоў і спецыялістаў практычна кожны дзень…

Тым больш, што паўтары тыдні таму адбылася калегія камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню Магілёўскага аблвыканкама, на якой было адзначана, што за шэсць месяцаў 2014 года аграпрамысловым комплексам Магілёўскай вобласці было выканана толькі тры прагнозныя паказчыкі з васьмі: узровень рэнтабельнасці продажаў у сельскай гаспадарцы, выручкі ад рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі, тавараў і паслуг на аднаго сярэднеспісачнага працаўніка, і паказчык па энергазберажэнню. Застаўся нявыкананым галоўны паказчык - тэмп росту валавай прадукцыі ў гаспадарках усіх катэгорый. Больш за тое, зніжэнне вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі ў гаспадарках усіх катэгорый дапушчана ў сямнаццаці раёнах Магілёўскай вобласці з дваццаці аднаго…



Пастаўлена задача абавязкова выправіць існуючую сітуацыю ў трэццім квартале і да канца 2014 года. Ну а заданні высокага кіраўніцтва ў нас выконваць навучыліся.

Як вы думаеце, шаноўныя чытачы, ці будуць пасля гэтага ў АПК Магілёўскай вобласці прыпіскі?

Сяргей СЕМЯНОВІЧ.

ЛІНІЯ ФРОНТУ



Як супрацьстаяць “ветру аншлюсу” з усходу

Што меней часу застаецца да чарговай прэзідэнцкай кампаніі 2015 года, то ўсё трывожней і трывожней становіцца на душы за лёс нашай роднай краіны, нашай Беларусі. Як паказвае час, палітычныя і эканамічныя падзеі ўнутры краіны, так і за яе межамі развіваюцца вельмі імкліва, і “вецер аншлюсу” з усходу з кожным днём толькі ўзмацняецца. Канчатковым каталізатарам працэсаў па вызначэнні лёсу Беларусі і можа стацца гэтая прэзідэнцкая кампанія.

Нажаль, на сёння ў беларускім грамадстве адсутнічае неабходная кансалідацыя, якая змагла бы пры неабходнасці падштурхнуць усіх да абароны сваёй Айчыны.

Вышэйшае чынавенства краіны актыўна занята вырашэннем жыццёва важнага для іх пытання - сваім абагачэннем, прадстаўнікі кіруючых органаў сілавых структураў “глядзяць у рот” сваім калегам з усходу. І тым, і другім няма розніцы, пад якім сцягам яны будуць сядзець у кіруючых крэслах, і чый партрэт будзе вісець у іх працоўных кабінетах.

Калі раней кіраўніцтва Беларусі хоць якім чына рэагавала на драпежніцкія памкненні усходняй суседкі, накшталт далучэння Беларусі шасцю абласцямі, то ў апошнія часы яно пабаіваецца нават неяк рэагаваць на падобныя выпады.

А рэагаваць ёсць на што і ёсць над чым задумацца. Чаго толькі варта заява віцэ-спікера расійскай Дзярждумы Жырыноўскага аб неабходнасці адраджэння Расійскай імперыі, з якой ён выступіў перад прэзідэнтам, прэм’ер-міністрам і дэпутатамі Дзярждумы Расійскай Федэрацыі 14 жніўня ў Ялце. Словы Жырыноўскага прагучалі як “бальзам на сэрца” прэзідэнту РФ, які ўжо шмат год толькі марыць аб гэтым. Па словах Жырыноўскага, у іх ужо ёсць і кандыдатура на пасаду Вярхоўнага кіраўніка імперыі ў асобе Пуціна.

Разважаючы аб узрастаючых пагрозах для незалежнасці нашай краіны, аб будучай прэзідэнцкай кампаніі, робячы канкрэтныя высновы, я заўсёды імкнуся азірнуцца назад у недалёкае мінулае - часы мінулых прэзідэнцкіх кампаній, падзеі якіх прайшлі праз самае сэрца і пакінулі на ім свой след…

І заўважаю, што і ў палітычным асяродку (не бяру пад увагу праўладныя партыі) няма неабходнай кансалідацыі ў пытаннях абароны нашай дзяржавы. Нажаль, ужо зноўку, больш чым за год да прэзідэнцкай выбарчай кампаніі, як і ў 1994, 2001, 2006, 2010 гадах, можна заўважыць шматлікія спробы некаторых апазіцыйных палітыкаў *“застолбить”* за сабой месца, або пазіцыю пракрамлёўскага беларускага палітыка з мэтай чакання новых “імпульсаў дэмакратыі” з Крамля.

Ужо зноўку, як гэта было ў 2001 г., гучаць размовы аб пошуку прэтэндэнта на пасаду прэзідэнта, які б падабаўся не толькі Захаду, а і Крамлю. Ужо зноўку, як гэта было ў 2006 і 2010 гадах, шэрагам палітыкаў вядуцца кулуарныя перамовы з мэтай атрымання палітычнай і фінансавай падтрымкі з усходу. Зноўку, як і напярэдадні мінулых кампаній, нярэдка гучыць “одобрямс” дзеянням Крамля на тэрыторыі Беларусі.

Разыходжанні апазіцыйных палітычных арганізацый у падыходах да ацэнкі ўзроўню пагрозаў незалежнасці краіны вылiліся задоўга да сённяшняга дня ў фармаванне двух кааліцый апазіцыйных сілаў.

І калі адзін бок інтэнсіўна выступае за выхад Беларусі з разнастайных саюзаў, створаных у межах краін былога Савецкага Саюза, за вывад замежных вайсковых базаў з тэрыторыі краіны, то прадстаўнікоў другой задавальняе ўваходжанне Беларусі ў саюзную дзяржаву разам з Расіяй, у Еўразійскі саюз, у іншыя аб’яднанні.

Нават планы расейскага боку па размяшчэнні ў 2015 годзе на тэрыторыі Беларусі, у Баранавічах, авіяпалка знішчальнікаў Су-27 не ўспрымаюцца імі як элемент узрастаючай пагрозы для незалежнасці нашай краіны. Размяшчэнне расійскай вайсковай базы, па іх меркаваннях, пойдзе толькі на карысць Беларусі.

Як і ў час прэзідэнцкай кампаніі 2010 года, у якой Партыя БНФ удзельнічала як самастойная палітычная сіла, на дадзеным этапе перад ёй зноўку паўстае складаная задача - змаганне за Беларусь на два “франты”: і з існуючым правячым рэжымам, і з магчымымі прарасійскімі кандыдатамі.

Нязменная пазіцыя Партыі БНФ, як абаронцы нацыянальных інтарэсаў, на сёння застаецца адзінай кансалідуючай ідэяй, вакол якой павінны яднацца здаровыя палітычныя сілы і дэмакратычнае грамадства ў змаганні ЗА БЕЛАРУСЬ.

Нацыянальныя інтарэсы, а не зацікаўленасць асобных груповак, павінны быць асновай нашай знешняй і ўнутранай палітыкі.

Для ўсіх нас Беларусь ёсць адзінай і непаўторнай Бацькаўшчынай.

Толькі разам мы здольныя супрацьстаяць узмацняючамуся “ветру аншлюсу” з усходу і дамагчыся годнага і незалежнага жыцця на беларускай зямлі.

Рыгор КАСТУСЁЎ,
намеснік старшыні Партыі “БНФ”.

Чаму ўсё больш з'яўляецца ЧЭРЫКАЎСКІХ ГАСТАРБАЙТЭРАЎ

Майму суседу-будаўніку Мікалаю надакучыў яго заробак у мільён рублёў у Чэрыкаве, і ён паехаў у Расію. А следам, як хутка даведаўся, і па гэтай дый іншым прычынах заціхла і ўсё наша чэрыкаўскае будаўніцтва.

НЕ ПРАГАДАЎ

Такім чынам, сусед угадаў, калі варта было мяняць дыслакацыю. І вось цяпер у месяц зарабляе ў эквіваленце 1200 долараў ЗША.

А сын яго, школьнікам яшчэ, займаўся ў нашым чэрыкаўскім фотагуртку. Потым скончыў Магілёўскі ўніверсітэт імя Куляшова, адпрацаваў у чэрыкаўскай школе настаўнікам два гады з заробкам у 600 тысяч рублёў ну, і канечне, кінуў тую школу, як толькі "адпрацаваў" дыплом. Да бацькі пакуль што не даехаў, "прытуліўся" ў Магілёве на адной з будоўляў, якая яшчэ не спынілася. Набіраецца вопыту і, як толькі падцягне кваліфікацыю, паедзе ў тую ж Расію.

Як бачым, у Чэрыкаве няма працоўнага месца з прыстойным заробкам для прадстаўнікоў ні маладога, ні старэйшага пакалення - ні рабочаму, ні інтэлігенту. Але можна сказаць, што да майго суседа лёс паставіўся яшчэ добразычліва, калі ўвогуле можна так назваць жыццё ў адрыве ад сям'і.

БУДАВАЦЬ ТРЭБА ДОМА...

Вось і бацьку яшчэ аднаго майго выхаванца фотагуртка не абмінуў лёс "гастарбайтара". Заробкі на прадпрыемстве, дзе ён працаваў кіроўцам грузавіка, знізіліся, а сям'ю карміць трэба ды і дзецям адукацыю неабходна забяспечваць. І падаўся чалавек у "дальние края". І вось неяк бачу на занятках, што ў хлопчыка вочкі ззяюць. Аказалася вось што.

— Заўтра тата мой прыязджае!

— Ці надоўга? — пытаюся.

— Ды не, на месяц усяго. З Расіі, дзе працуе. Даўно дома не быў, але хоць месяц пабудзем разам...

— А што твой тата робіць у той Расіі?

— Кіроўцам на машыне працуе. Грузы розныя дастаўляе з аднаго горада ў іншы...

— А я думаў, што дамы будуе там, як многія іншыя нашы чэрыкаўляне...

— Будаваць дамы трэба дома! - раптам па-даросламу закончыў нашу размову мой юны субяседнік.

Андрэй Юркоў, эканамічны аглядальнік:

- У гэтай тэме, трэба прызнаць, некалькі складнікаў.

Першае. Па вялікім рахунку, уладу задавальняе тое, што людзі не дураць ёй галаву, а самастойна шукаюць і знаходзяць выйсце з нашага кепскага эканамічна-сацыяльнага становішча.

Другое. Людзей ніякім чынам не варта ганьбіць ці коса пазіраць на іх за тое, што яны едуць некуды па заробкі. Яны ўсё робяць правільна. Мяжа адкрыта, дык чаму б не скарыстацца гэтай магчымасцю? Тым больш што ёсць спрыянне з боку Расіі для нашых суайчыннікаў. Там не толькі заробкі вышэйшыя, але і правы на жыхарства можна дамагчыся, і пенсію расійскую зарабіць, якая з нашай пенсіяй непараўнальная. Такім чынам, адкрытасць гэтая цяпер працуе цалкам на карысць суседзяў. Але гэта не іх віна, праўда?..

Трэцяе. Для таго, каб павярнуць усё ў іншы бок, патрэбны рэформы, пра якія сто разоў сказана, але на якія наша ўлада няздольная. Рэформы патрэбны тыя, што закрануць уласнасць, пачацца яны павінны з прыватызацыі, а гэта першы крок да дэмакратыі, свабод і правоў чалавека. На гэта ўлада адважыцца не можа, як бачым, ужо шмат гадоў. А вось менавіта народная, шырокая прыватызацыя і людзей бы вярнула дадому, і рэформы паскорыла б, і эканоміку ў эфектыўны бок павярнула б.

Тут закон - працэй не бывае: рыба шукае дзе глыбей, а чалавек - дзе лепш...

ДА ВЕДАМА

Згодна з данымі даследавання, у Беларусь паступае недзе 1,3 млрд долараў ад эмігрантаў за мяжой - гэта каля 2% ВУП. Адзін з аўтараў гэтага даследавання, Аляксандр Лучанок, падкрэслівае: *"Гэта істотная падтрымка нацыянальнай эканомікі".*



Сямён ПАНІЗОЎЦАЎ.
Віктар ВОЙТ.

www.svabodaby.net

АДУСЮЛЬ ПАКРЫХУ

Лукашенко приказал по максимуму перейти на строительство бетонных дорог. Он выдвинул новое требование, посетив в Минском районе один из участков строящейся второй МКАД. *«Этим дорогам быть. И не так, как вы наметили, а по максимуму»*, - заявил Лукашенко. В качестве аргумента, приводится утверждение, что гарантийный срок на бетонные дороги доходит до 25 лет при максимуме в 10 лет на асфальтное покрытие. Бетонные дороги, по его словам, способны выдерживать больше нагрузки и соответственно предоставляют большие возможности по проезду тяжеловесного транспорта. Но самый главный аргумент сводится к тому, что при строительстве бетонных дорог используется местное сырье, в то время как в производстве асфальта используется битум, вырабатываемый из импортной нефти.

ОТОВСЮДУ ПОНЕМНОГУ

Алексей работает по распределению в школе могилёвского района. За сентябрь с молодого специалиста просят 300 тысяч на кружки и подписку при зарплате в 3 миллиона. *"Ежемесячно с учителей собирают деньги на платные услуги, например, дополнительные занятия для учеников. В других школах дети оплачивают в банке и приносят квитанции. А у нас сразу собирают с учителей 150 тысяч, а мы как угодно должны отбивать эти деньги"*, — объясняет Алексей. - *Ещё нужно заплатить за "обязательную" подписку на издания раз в три месяца. "Там, "СБ. Беларусь сегодня", "Учительская". До этого мы тратим на проезд около 30 тысяч в день и что тогда останется от зарплаты?".*

"Вообще, если есть такая ситуация, то она противоречит закону. Но есть разные ситуации. Сегодня нельзя сказать, что отрасль образования финансируется под нужды. Если есть востребованность у учителей, то почему не делать платные услуги. Но планов, как таковых, нет", — объясняют в управлении образования облисполкома.

Подготовил
Антон ДУБОЛОМОВ.

Вторичные отходы и идеология

Мнение из глубинки

Всё в нашей стране поставлено с ног на голову. Власть вот уже более двадцати лет безуспешно стремится реализовать те лучшие наработки, которые были в СССР. Но эти её действия принимают всё более уродливый характер. Хочу поделиться своими мыслями по вопросу ныне существующей системы сбора и переработки вторичного сырья. Не секрет, что это очень важная и актуальная тема по многим аспектам.

Первое, что хотелось бы отметить, что отходы являются огромным потенциальным источником дешёвого сырья для многих отраслей промышленности. Второе, их утилизация и переработка являются важным аспектом защиты окружающей среды. Третье, это очень существенный аргумент в деле воспитания общества в свете бережного отношения к природе, культуры поведения в обществе и быту, воспитания подрастающего поколения, т.е. тех, кто будет жить после нас. Последние события, которые происходят на наших глазах говорят о что, идеологическая работа власти в этом направлении имеет кратковременный успех, но больше в этом негативных последствий для будущего.

С чем это связано? Во-первых, жёсткие указания сверху и нереальные планы по сдаче вторичного сырья, доведенные до каждого человека, включая новорожденных и прикованных к постели стариков. Планы, доведенные до учреждений, организаций и предприятий Хотимского района приведены в этой таблице:


На одного человека	План для района	На среднюю семью, состоящую из 4 чел.
43 кг	517 тонн макулатура	152 кг
17 кг	204 тонны стеклобой	68 кг
6.4 кг	77 тонн полиэтилена	25.6 кг
0.5 кг	17 тонн текстиль	2 кг
85 кг	1017 тонн металлолом	340 кг

Такое количество вторсырья необходимо собрать и сдать в течение года. Учитывая, что каждый человек на протяжении года производит и выбрасывает 300 кг отходов, я думаю, что комментарий к данной таблице излишен, но некоторые пояснения необходимы.

Во-первых, скажите, где средней семье, состоящей из 4 человек найти 340 кг металлолома, а тем паче 152 кг макулатуры, не говоря о других показателях? Одни вопросы. Эти цифры говорят о том, что нереальность доведенных планов налицо. Но тем не менее, несмотря ни на что, они должны быть выполнены, потому что существующая система власти на местах не позволяет расслабляться. План должен быть выполнен любой ценой, говорят идеологи.

Во-вторых, данная акция, а по-другому её не назовёшь, приводит к большим моральным издержкам в воспитании молодёжи. В чём это выражается? Всем школьникам заведены лицевые счета по сдаче вторсырья и от выполнения зависит их положения в школе. Все мы в прошлом были школьниками и на идейной основе выполняли эту работу. А теперь школьники стали конкурентами бомжей, а ещё хуже то, что за детей добычей вторсырья занимаются родители, бабушки и дедушки. А в это время их чадо сидит за компьютером. Напрашивается вопрос: кто детям этих отпрысков будет заготавливать вторсырьё?

В-третьих, совсем в неловком положении находятся предприниматели. Планы, доведенные до них несоизмеримы их коммерческой деятельности. Власть считает, что они богатые и могут привезти вторсырьё из-за границы. Всё это говорит о том, что мы живём в худшие времена диктата и кампанейщины, что воочию проявляется в данной, как я считаю, политической акции. Но наш народ такой акцией объединить нельзя. Советский Союз развалили идеологи, они же пытаются погубить и суверенную Беларусь. Вот так и живём.



Валерий КОРОНКЕВИЧ.

Магілёўскі ВЫБАР

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Адрас рэдакцыі: 213155, Магілёўская вобласць, Магілёўскі раён, в.Брылі, вул.Юбілейная, 6-7. Тэл. 8-0222-710451
E-mail: mikolabryl@gmail.com. Выдавец Яцкова Ала Міхайлаўна.
Наклад 299 асобнікаў. Фармат А-4. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 24.09.2014 г. у 10.00.